

**САХАР Вольга,**
вучаніца 9 класа
ДУА «Маркаўская сярэдняя школа» Маладзечанскага раёна.
Тэма: ***«Сон у летнюю ноч»***

Што ж без цябе, настаўнік?
Хто ж без цябе, настаўнік?
*Фёдар Янкоўскі*

**Цёпла. Ціха. Аднекуль даносіцца прыемнае гучанне начных мелодый прыроды...**

**«Каралеўскі» баль. Безліч пар кружыцца ў танцы. Чароўны вальс прымушае задумацца над вечным, запрашае зазірнуць у мінулае, заварожвае невядомай будучыняй... Ах, як бы спыніць гэтыя імгненні!**

**Неяк усё выразней, перарываючы мелодыю, пачала даносіцца гутарка-ўспамін жанчын, якія сядзелі збоку і любаваліся, як танцуюць маладыя пары.**

**«Яна дала свету не толькі высокакваліфікаваных спецыялістаў, але і людзей, якія ўсведамлялі адказнасць, ускладзеную на іх, якія не саромеліся працы, былі акуратнымі, любілі сваю зямлю, былі надзейнымі таварышамі і калегамі, паважалі іншых, з гонарам пацвярджалі сябе як прафесіяналы. Канечне, усяго хапала. Расказвалі пра такія выпадкі, калі за парушэнне рэжыму маглі пасадзіць нават у карцар, пазбавіць стыпендыі або зусім выключыць з установы. Але гэта датычылася толькі самых злосных парушальнікаў. Хаця, відаць, з такімі сітуацыямі сустракаліся нячаста: дзень быў распісаны ледзь не пахвілінна. Акрамя вучобы, абавязковым было наведванне царквы, удзел у штодзённай і святочнай малітве, праца ў садзе, на агародзе, па добраўпарадкаванні тэрыторыі, наведванне заняткаў па народных рамёствах, «куратарства». Дык што цікава? Усе стараліся быць узорам для іншых, мала**



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

хто скардзіўся на цяжкасці, несправядлівасць ці яшчэ што. Вось і выйшлі ўсе САПРАЎДНЫМІ, народнымі. Той самы Міхась Чарот ці Рак-Міхайлоўскі...»

Зноў музыка, танцы, людзі. Зноў незразумелая ўзнёсласць, акрыленасць. Ды толькі новыя пытанні з'яўляюцца... Зноў гутарка. Тая ж самая? Новая? Пакуль што цяжка разабрацца.

«Гэтыя войны ўсё перавернуць з ног на галаву! Толькі, здаецца, усталявалася ўсё, развівацца пачало – ды на табе! Каму ад іх лепш? Дзеля чаго яны? Каб усё вынішчаць, руйнаваць? Не сышліся ў поглядах некалькі чалавек, а пакутаваць павінна ўсё грамадства! Гэта страшна...»

«Што праўда, то праўда. Можа сёння мы былі б на іншай ступені развіцця, але... Ды адно радуе: наш народ не толькі трываць умее, не толькі абараняцца, але і гнаць ворага. Гэты дух і вера, відаць, дапамаглі ўсё адбудаваць, падняць з папялішчаў краіну не адзін раз».

Ва ўнісон пачуўся трэці голас: «І ў нас таксама грамадска-палітычныя працэсы наперакрэслілі ўсяго: то народнае вучылішча, то польская школа на шэсць класаў, то наёмныя памяшканні, то панскі дом, то зусім нічога не было. І толькі дзякуючы энтузіястам, адданым сваёй справе, іх імпэту і перакананасці ў неабходнасці развіцця (як грамадства ў цэлым, так і кожнай асобнай душы) сёння можна казаць пра больш чым паўвекавую гісторыю... І ведаеце, толькі за гэты час тут была прынята і выгадавана не адна дынастыя».

І больш ніякіх гутарак чуваць ужо не было. Толькі ўсё тая ж чароўная мелодыя... І толькі праз некаторы час усё стала на свае месцы.

Аказалася, гутарка вялася пра Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю, якая існавала з 1864 да 1920 года. Гэтая навучальная ўстанова рыхтавала народных настаўнікаў праваслаўнага веравызнання. Пазней было распрацавана палажэнне, якое рэгулявала ўнутраны распарадак, кадравы склад выкладчыкаў, умовы залічэння і пражывання семінарыстаў, вучэбна-выхаваўчую работу, тэрмін навучання і практыкі, колькасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

урокаў у тыдзень і гадзін па кожным прадмеце і г. д. А ў 1881 годзе былі зацверджаны «Правілы аб спагнаннях, якія накладаліся на выхаванцаў настаўніцкіх семінарый Віленскай вучэбнай акругі», дзе і былі акрэслены ўсе магчымыя пакаранні за парушэнні ўнутранага распарадку. Аднак усё гэта не палохала тых, хто хацеў вучыцца сам і потым вучыць іншых. Адным з такіх выпускнікоў Маладзечанскай семінарыі быў беларускі паэт і грамадскі дзеяч Міхась Чарот.

Другая размова – гэта не што іншае, як з'яўленне і гісторыя нашай роднай Маркаўскай школы. Яе будынак (у сучасным варыянце) быў узведзены ў 1961 годзе, да гэтага былі наёмныя памяшканні, рэарганізацыі ў самой сістэме (то беларуская, то польская; то шэсць класаў, то сямігодка). А вось ужо з названага года школа ні разу не закрывалася і працуе для сваіх вучняў.

Дарэчы, энтузіястаў таксама атрымалася «расшыфраваць». Гэта тыя настаўнікі, якія не толькі ў нас працавалі, але і былі на фронце, адбудоўвалі пасля вайны Мінск і іншыя гарады, вёскі нашай краіны. Так, першым дырэктарам «новай» школы быў Віктар Іванавіч Баравец, ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Амаль чвэрць стагоддзя кіраваў нашай установай Канстанцін Конанавіч Дорах, выдатнік народнай асветы БССР, франтавік. Ён разам са сваёй жонкай (пазней заслужанай настаўніцай БССР) «уздымалі» з папялішча нашу сталіцу, аддана працавалі ў Пранчэйкаве, Радашковічах, Чысці, а з 1962 года жылі ў Маркаве. Яны «выпусцілі ў свет» не адно пакаленне вучняў, якія ўспамінаюць сваіх настаўнікаў з удзячнасцю. Шмат сіл аддалі яны нашай школе: вялася актыўная турысцка-краязнаўчая праца, ладзіліся разнастайныя вечарыны і мерапрыемствы, пастаяннымі станавіліся паходы, дзякуючы іх намаганням быў адкрыты музей баявой і працоўнай славы. Вера Мікітаўна і сёння не сядзіць без справы. Ні адно мерапрыемства ў жыцці Маркава не адбываецца без удзелу народнага фальклорнага ансамбля «Маркаўчанка», якім нязменна кіруе вось ужо 45 год яна, сапраўдная настаўніца. А ў апошні час у нас аднаўляюцца мясцовыя традыцыі. Так, у першы дзень

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вялікадня ўсе – і дзеці, і дарослыя, і вяскоўцы, і госці – выводзяць Луку пад кіраўніцтвам Веры Мікітаўны Дорах.

Гэтыя педагогі далі добры старт для наступных пакаленняў. І нашы сённяшнія настаўнікі пераналі гэту эстафету выдатна.

А дынастыі? Гэта таксама пра Маркаўскую школу. У нас не толькі вучыліся, не толькі сталі настаўнікамі, але і працавалі ажно тры дынастыі. Дынастыя, добра вядомая нам усім, – гэта сённяшнія настаўнікі беларускай мовы і літаратуры Іна Васільеўна (якая яшчэ з'яўляецца і намеснікам дырэктара па вучэбнай рабоце) і Кацярына Аляксандраўна Ермаковіч. А прыклад, відаць, падаў ім Бычок Васілій Міхайлавіч, іх бацька і дзед, які таксама быў і застаецца аматарам слова, адданым прыхільнікам роднай мовы і літаратуры, паважаным кіраўніком (ён доўгі час працаваў дырэктарам суседніх школ). Гэта дынастыя, відаць, адзіная, дзе ўсе настаўнікі выкладалі адзін і той жа прадмет – беларускую мову і літаратуру.

Добра ведаюць сёння і былую настаўніцу пачатковых класаў Мядзвецкую Людмілу Уладзіміраўну. Яе дачка, Сапач Ларыса Фёдараўна, пасля размеркавання і цяпер працуе ў Маркаўскай сярэдняй школе. Можа іх дынастыя яшчэ знойдзе свой працяг праз сына, вучня 11 класа, які стаіць цяпер перад выбарам будучай прафесіі.

Ёсць яшчэ адна настаўніцкая сям'я ў нашай школе. Корсак Ганна Канстанцінаўна – выдатны педагог-арганізатар, настаўнік музыкі, які імкнуўся паказаць усю прыгажосць гукаў кожнаму вучню. Сёння яна працуе ў дзіцячым садку, спасцігае таямніцы музычнага свету разам з маленькімі дзеткамі. Яе дачка, наша выпускніца, залатая медалістка, Алена Іванаўна Мацкевіч выкладае англійскую мову ў гарадской школе.

Наўрад ці можна казаць пра настаўніка былы, чужы, далёкі. Ён ЁСЦЬ, самы блізкі і сапраўдны. Думаю, многія пагодзяцца са мной, што настаўнік – гэта самае светлае ў школьным (і не толькі школьным) жыцці. Здавалася б, некалькі літар у звычайным слове проста стаяць побач, але якое значэнне, колькі эмоцый і пачуццяў звязана з імі, нашымі настаўнікамі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ